*Генеральны дырэктар Міжнароднай арганізацыі працы Хуан САМАВІЯ:*

**Спецыяльна для «Звязды»**

# ЧАС РАТАВАЦЬ РЭАЛЬНУЮ ЭКАНОМІКУ

**У спецыяльна напісаным для «Звязды» артыкуле генеральны дырэктар Міжнароднай арганізацыі працы (МАП) дзеліцца сваімі думкамі аб глабальным фінансавым крызісе і прапановамі па яго пераадоленні з найменшымі наступствамі для звычайных людзей і рэальнага сектара эканомікі. Прапануем неафіцыйны пераклад артыкула.**



Мы не ведаем, як доўга працягнецца фінансавы крызіс і наколькі сур'ёзным ён будзе. Але мы дакладна ведаем: калі не прыняць рашучых мераў, крызіс акажа моцны, глабальны і сістэмны ўплыў на жыццё і ўмовы працы людзей, разбурыць іх чаканні і надзеі. Пошук шляхоў эфектыўнага фінансавага рэгулявання і стварэнне глабальнай сістэмы стрымлівання і працівагі — крокі ў правільным накірунку, аднак нашы дзеянні не павінны абмяжоўвацца рамкамі фінансавай сістэмы. Мы маем справу не проста з крызісам на вуліцы Уол-стрыт — крызіс сёння крочыць па вуліцах усяго свету. Трэба тэрмінова стварыць эканамічны план выратавання работнікаў і рэальнай эканомікі, распрацаваць палітычныя меры і механізмы стварэння дастойных працоўных месцаў і прадукцыйных прадпрыемстваў. Неабходна больш шчыльна ўвязаць павышэнне вытворчасці з узроўнем заработнай платы, а эканамічны рост — з занятасцю. Людзі павінны быць упэўнены, што эканоміка працуе на іх карысць.

Дзейнічаць трэба неадкладна. МАП ужо зрабіў першыя прагнозы адносна таго, як крызіс адаб'ецца на паўсядзённым жыцці людзей на ўсіх сацыяльных узроўнях. Па нашых ацэнках, к канцу 2009 года колькасць беспрацоўных у свеце павялічыцца на 20 мільёнаў чалавек і ўпершыню ў гісторыі перавысіць 200-мільённую рысу. Найбольш сур'ёзна і ў першую чаргу пацерпяць тыя, хто працуе ў такіх сектарах эканомікі, як будаўніцтва, аўтамабільная галіна, турызм, фінансы, сфера паслуг і нерухомасць.

Больш за тое: колькасць «працуючых бедных», якія жывуць менш чым на 1 долар у дзень, можа ўзрасці на 40 мільёнаў, а тых, хто жыве на 2 долары ў дзень — больш чым на 100 млн чалавек. І нават гэтыя сумныя прагнозы могуць аказацца заніжанымі, калі не прыняць неадкладныя меры для процідзеяння сённяшняму эканамічнаму спаду і рэцэсіі, якая надыходзіць. Перш за ўсё трэба засяродзіцца на людзях, на прадпрыемствах, на рэальным сектары эканомікі. Для гэтага трэба дзейнічаць па чатырох накірунках.

**Па-першае,** забяспечыць крэдытныя патокі. Надзвычайныя меры тут ужо прымаюцца.

**Па-другое,** падтрымаць тых, хто найбольш слабы. Гаворка ідзе пра шырокі набор мераў, уключаючы абарону пенсій, страхаванне на выпадак беспрацоўя, прадастаўленне крэдытаў малым і сярэднім прадпрыемствам, якія сёння з'яўляюцца асноўнай крыніцай занятасці.

**Па-трэцяе,** ажыццяўляць цвёрдую дзяржаўную палітыку падтрымкі прадукцыйнасці працы і дзелавой ініцыятывы. Мы ўжо дастаткова пацярпелі ў выніку краху фінансавай сістэмы, якая страціла маральныя арыенціры. Неабходна вярнуць фінансам іх законную ролю. А яна заключаецца ў тым, каб падтрымліваць рэальную эканоміку, прадастаўляць прадпрымальнікам сродкі на развіццё і мадэрнізацыю, стварэнне працоўных месцаў, вытворчасць тавараў і паслуг. Іншымі словамі, фінансы павінны падтрымліваць рэальны сектар эканомікі.

**МАП — спецыялізаванае агенцтва сістэмы ААН, якое займаецца рэалізацыяй прынцыпаў сацыяльнай справядлівасці. МАП распрацоўвае міжнародныя працоўныя нормы ў форме канвенцый і рэкамендацый, устанаўлівае мінімальныя стандарты ў галіне асноватворных працоўных правоў. Таксама агенцтва распрацоўвае і іншыя стандарты, якія рэгулююць умовы па ўсім спектры працоўных пытанняў, такіх як палітыка ў галіне занятасці, сацыяльная абарона, ахова працы і г.д. Штаб-кватэра МАП знаходзіцца ў Жэневе, Швейцарыя.**

**Па-чацвёртае,** — і гэта вельм важна — трэба ліквідаваць карэнныя прычыны сітуацыі, якая склалася. Яшчэ задоўга да цяперашняга фінансавага крызісу мы ўжо былі ўведзены ў крызіс, звязаны з вялізнымі маштабамі галечы, сацыяльнай няроўнасцю, якая расце пашырэннем нефармальнай і неабароненай занятасці. Глабалізацыя прынесла не толькі выгады для многіх гэты працэс стаў незбалансаваным, няўстойлівым і не забяспечыў справядлівае размеркаванне даброт. Неабходна знайсц збалансаваны падыход і засяродзіцца на абароне людзей і вытворчасці. Гаворка ідзе пра выратаванне рэальнага сектара эканомікі.

Не будзем забываць: людз ацэньваюць уласнае жыццё і перспектывы на будучыню галоўным чынам праз прызму сваёй працы. Сёння больш актыўна, чым калі-небудзь, трэба распрацоўваць палітыку, накіраваную на задавальнен не асноўнай патрэбнасці чалавека — мець справядлівыя шанцы на дастойную работу.

Каб падтрымліваць адкрытую эканоміку і адкрытае грамадства, зацікаўленыя міжнародныя арганізацыі павінны працаваць разам, ствараючы новыя асновы для справядлівай і ўстойлівай глабалізацыі. Сёння гандлёвыя перагаворы перарваны, фінансавыя рынкі на мяжы краху, працягваецца працэс змянення клімату. Каб вырашыць гэтыя праблемы, трэба прымяняць падыход, які заснаваны на ўстойлівым развіцці і спалучае меры ў фінансавай, эканамічнай сацыяльнай і працоўнай сферы, а таксама ў галіне аховы навакольнага асяроддзя. На крызіс нельга адказваць непрадуманымі палітычнымі мерамі. Надышоў час думаць і дзейнічаць дакладна і па-новаму, каб вырашаць вялізныя праблемы, што стаяць перад намі.

*Жэнева.*

**Да друку падрыхтаваў Леанід ЛАХМАНЕНКА.**